Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка»

УДК 801.7:930.27(476)(043.3)

Калечыц
Іна Леанідаўна

# Адлюстраванне сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў эпіграфічных помніках X – першай паловы XIV ст.

Аўтарэферат дысертацыі
на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Мінск, 2007

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Работа выканана ва ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

**Навуковы кіраўнік –** **Люты Анатоль Міхайлавіч**
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі, установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

**Афіцыйныя апаненты:** **Марзалюк Ігар Аляксандравіч**
доктар гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова»

**Груша Аляксандр Іванавіч**
кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела гісторыі Беларусі сярэдніх вякоў і пачатку новага часу ДНУ «Нацыянальная акадэмія навук Беларусі»

**Апаніруючая арганізацыя –** установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы»

Абарона адбудзецца 21 снежня 2007 г. у 16 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 02.21.03 пры ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка» па адрасу: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, ауд. 482, bagdanovich.sovet@tut.by, тэл. 200-82-53.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

Аўтарэферат разасланы « 20 » лістапада 2007 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый І.І. Багдановіч



# УВОДЗІНЫ

Асноўнымі пісьмовымі крыніцамі па гісторыі Беларусі X – першай паловы XIV ст. з'яўляюцца летапісы, якія змяшчаюць у сабе шмат каштоўнай інфармацыі. Аднак, яе апісанне носіць дакументальна-дзелавы характар. Іншыя *пісьмовыя помнікі* Беларусі, якія змяшчаюць унікальную фактычную інфармацыю, менавіта, эпіграфічныя, даследаваны вельмі слаба, нягледзячы на тое, што яны таксама з'яўляюцца важнымі крыніцамі для вывучэння сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных працэсаў, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў X – першай палове XIV ст. На сённяшні дзень на тэрыторыі Беларусі знойдзена больш за 100 эпіграфічных помнікаў X – першай паловы XIV ст., якія *не з'яўляліся прадметам* спецыяльнага даследавання. Іх аналіз і сістэматызацыя дазволяць больш грунтоўна даследаваць сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурныя працэсы, якія мелі месца на тэрыторыі нашай краіны і тым самым *дапоўніць крыніцазнаўчую базу вывучэння гісторыі* Беларусі ў X – першай палове XIV ст. Усё гэта абумовіла неабходнасць дапрацоўкі і ўдакладнення методыкі даследавання эпіграфічных помнікаў, стварэння іх класіфікацыі з мэтай даследавання ўсёй сукупнасці помнікаў эпіграфікі азначанага перыяду як гістарычных крыніц.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.** Дадзенае навуковае даследаванне звязана з навуковай тэмай кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка «Навукова-метадычныя аспекты рэалізацыі дзейнаснага падыходу ў выкладанні гісторыі і дапаможных гістарычных дысцыплін» (рэгістрацыйны № 20064050 дзяржаўнай рэгістрацыі).

**Мэта і задачы даследавання.** Мэта дадзенай работы – даказаць, што шляхам вывучэння эпіграфічных помнікаў магчыма даследаванне асобных пытанняў сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі ў X – першай палове XIV ст.

Для дасягнення вызначанай мэты неабходна вырашэнне наступных задач:

- *прааналізаваць гістарыяграфію праблемы і метады даследавання.* Абаснаваць аўтарскі падыход да эпіграфічных помнікаў як гістарычных крыніц і новыя метады іх даследавання;
- даць класіфікацыю крыніц і ахарактарызаваць кожную групу эпіграфічных помнікаў;
- прааналізаваць эпіграфічныя помнікі X – XII стст. як гістарычныя крыніцы і паказаць, якія пытанні палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі можна ўдакладніць з іх дапамогай;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- паказаць, як змены ў палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці грамадства на беларускіх землях знайшлі сваё адлюстраванне ў эпіграфічных помніках XIII – першай паловы XIV ст.;
- параўнаць эпіграфічныя помнікі Беларусі з помнікамі іншых рэгіёнаў, якія былі населены ўсходнімі славянамі і паказаць асаблівасці, характэрныя для беларускіх земляў.

**Аб'ектам даследавання** з'яўляецца сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё Беларусі ў X – першай палове XIV ст.; **прадметам даследавання** – сукупнасць эпіграфічных помнікаў X – першай паловы XIV ст., з дапамогай якіх больш грунтоўна вывучаюцца сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону.**

1. Гістарыяграфія гісторыі вывучэння эпіграфічных помнікаў X – першай паловы XIV ст. сведчыць аб тым, што яны з'яўляліся прадметам даследавання археалогіі, палеаграфіі, філалогіі, гісторыі культуры, краязнаўства, гісторыі. Але да апошняга часу ніхто з гісторыкаў не выкарыстоўваў сукупнасць гэтых крыніц з мэтай удакладнення пытанняў сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі ў перыяд сярэдневякоўя.
2. Археалагічныя, мовазнаўчыя, палеаграфічныя і культуралагічныя метады даследавання вымушалі даследчыкаў выкарыстоўваць негістарычную метадалогію, прыходзіць да высноў, якія амаль не закраналі праблем гістарычнага мінулага Беларусі ў далетапісны перыяд пісьменнасці. Выкарыстанне сучаснай метадалогіі даследавання, заснаванай на міждысцыплінарным падыходзе да вывучэння кожнай крыніцы, а таксама выкарыстанне ідэаграфічнага, гісторыка-параўнальнага, гісторыка-тыпалагічнага метадаў даследавання робяць магчымым выкарыстанне эпіграфічных помнікаў у якасці крыніц для вывучэння праблем палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі ў X – першай палове XIV ст. Выкарыстанне эпіграфічных помнікаў у якасці гістарычных крыніц магчыма толькі пры распрацоўцы класіфікацыі помнікаў.
3. Вялікая колькасць эпіграфічных помнікаў пісьменнасці з'явіўшыхся ў X – XII стст. звязана з узвышэннем ролі гарадоў і характэрным для гэтага часу перыядам феадальнай раздробленасці. Развіццё пісьменнасці абумоўлена не толькі з рэлігійнымі, але і з бытавымі патрэбамі: пісьменнасць не была характэрнай для абмежаванага кола людзей. Эпіграфічныя помнікі пісьменнасці з'яўляюцца характэрнымі прыметамі гарадзішчаў і феадальных сядзіб. Пераважную колькасць помнікаў эпіграфікі складаюць помнікі з кірылічнымі надпісамі. Іншамоўныя надпісы нанесены на імпартныя прадметы або наносіліся выхадцамі з іншых тэрыторыі. Помнікі эпіграфікі даюць звесткі аб межах княстваў. З-за адсутнасці прамых звестак аб хрышчэнні беларускіх земляў, эпіграфічныя помнікі з'яўляюцца сведчаннем



распаўсюджання хрысціянства па ўсходняму абраду, а таксама сведчаннем двухвер'я. Эпіграфічныя помнікі пісьменнасці даюць звесткі аб сацыяльным і нацыянальным складзе насельніцтва, існаванні княжацкай адміністрацыі. Помнікі эпіграфікі ўдакладняюць летапісныя звесткі.
4. Росквіт існавання эпіграфічных помнікаў працягваўся некаторы час і ў XIII ст. У канцы XIII – пачатку XIV ст. назіраецца рэзкае памяньшэнне колькасці эпіграфічных помнікаў, што напрамую звязана з эканамічнымі і палітычнымі прычынамі. Эпіграфічныя крыніцы XIII – першай паловы XIV ст. удакладняюць летапісныя звесткі, даюць інфармацыю аб этнічным складзе насельніцтва, а таксама даюць звесткі аб укараненні хрысціянства і мясцовай вытворчасці прадметаў культа.
5. Эпіграфічныя помнікі X – першай паловы XIV ст., знойдзеныя на тэрыторыі Беларусі, маюць агульныя рысы не толькі па форме, але і па зместу крыніц, што сведчыць пра ўдзел усходнеславянскага рэгіёну ў агульным гістарычным працэсе, агульных накірунках і характары развіцця эканомікі, сацыяльнай структуры і культуры, нягледзячы на розныя ўнутры- і знешнеэканамічныя ўмовы. Эпіграфічныя помнікі таксама маюць свае адметныя рысы і асаблівасці (ў відах помнікаў, змесце надпісаў і іх мове), адрозненні ад аналагічных крыніц іншых рэгіёнаў, дзе пражывалі ў гэтыя часы ўсходнія славяне, што сведчыць на карысць існавання не адзінай культуры, а адзінства культур.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Даследаванне з'яўляецца самастойнай аўтарскай працай і ўяўляе сабой падрабязны і ўсебаковы разгляд пытання. Распрацавана методыка фіксацыі эпіграфічных помнікаў шляхам метадаў прарысоўкі і лічбавай фота- і відэаздымкі прадмета і надпісу на ім, якія дапаўняюць адзін аднаго, з наступным палеаграфічным і тэксталагічным аналізам надпіса і рэчазнаўчым аналізам прадмета. Распрацавана класіфікацыя эпіграфічных помнікаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі. Дадзеная навуковая праца з'яўляецца першым комплексным даследаваннем эпіграфічных помнікаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі, якое ўключае ў сябе іх падрабязнае апісанне і класіфікацыю з мэтай удакладнення і пашырэння нашых звестак аб палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці Беларусі ў X – першай палове XIV ст. Складзены каталог эпіграфічных помнікаў. Праводзіцца параўнанне з аналагічнымі помнікамі ўсходніх славян іншых рэгіёнаў для паказу не толькі асаблівасцяў, але і агульных рысаў гэтай вельмі складанай і мнагапланавай крыніцы. Вызначана храналогія, эвалюцыя надпісаў, уплывы з іншых тэрыторый. Уведзены ў навуковы абарот шэраг эпіграфічных помнікаў, разглядаюцца спрэчныя пытанні па некаторых помніках.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Асобныя палажэнні дысертацыі былі прадстаўлены суіскальнікам на рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні» (Мінск, 25

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кастрычніка 2002 г.); міжнароднай навуковай канферэнцыі «Прырода, чалавек, культура: праблемы гармоніі» (Мінск, 25–26 сакавіка 2003 г.); рэспубліканскай навуковай канферэнцыі, прысвечанай Х Святу беларускага пісьменства і друку (Полацк, 5–6 верасня 2003 г.); рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі» (Мінск, 28 лістапада 2003 г.); міжнароднай навуковай канферэнцыі «Куляшоўскія чытанні» (Магілёў, 11–12 снежня 2003 г.); рэспубліканскай навуковай канферэнцыі «Музейныя чытанні» (Мінск, 29–30 лістапада 2004 г.), міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі «Европа: актуальные проблемы этнокультуры» (Мінск, 27 красавіка 2007 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Вынікі дысертацыйнага даследавання апублікаваны ў 17 артыкулах, у тым ліку, 6 артыкулаў, агульны аб'ём якіх складае 3 д.а. апублікаваны у рэцэнзуемых выданнях, колькасць іншых публікацый складае 11 артыкулаў агульным аб'ёмам 1,27 д.а.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Даследаванне складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, 4 глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу і дадатку (ілюстрацый). Агульны аб'ём дысертацыі – 224 старонкі, у тым ліку бібліяграфічны спіс – 13 старонак, дадатак – 107 с.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Глава 1 "Аналітычны агляд літаратуры"** прысвечана праблеме вывучэння эпіграфічных помнікаў Беларусі перыяду Х – першай паловы XIV стст., якая не была дастаткова распрацавана ў гістарыяграфіі. Помнікі разглядаліся паасобку ці ў групах як археалагічныя крыніцы або як помнікі пісьменства, ці як адлюстраванне асобных з'яў сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця сярэдневяковай Беларусі. Рабіліся спробы разгляду эпіграфічных помнікаў у сукупнасці, але як доказ існавання пісьменнасці на тэрыторыі сярэдневяковай Беларусі.

Цікавасць да пісьмовых помнікаў узрасла з пачаткам развіцця гістарычнага краязнаўства і, тым самым, з першай зацікаўленасцю да гістарычных помнікаў. У першую чаргу, цікавасць выклікалі неардынарныя манументальныя помнікі. Так, першымі эпіграфічнымі помнікамі, прыгаданнамі як гістарычныя крыніцы, трэба лічыць Барысавы камяні, апісаныя М. Стрыйкоўскім у «Хроніцы польскай, літоўскай, жамойцкай». У XIX ст. вывучэнне эпіграфічных помнікаў працягвалася, у асноўным, вучонымі-краязнаўцамі (Я.Ф. Канкрыным, А.М. Семянтоўскім, П.І. Кепненам, Я.П. Тышкевічам, М.Ф. Кусцінскім, А.П. Сапуновым, Е.Р. Раманавым).

У пачатку XX ст. І.А. Шляпкін вылучыў так званую рэчавую палеаграфію (па сутнасці тую ж эпіграфіку). Але працяглы час эпіграфічны матэрыял так і заставаўся толькі ілюстратыўным. З 1936 г. А.С. Арловым пачынаецца сістэматычнае вывучэнне помнікаў эпіграфікі. Павелічэнне колькасці



эпіграфічнага матэрыялу дало пачатак некалькім напрамкам ў вывучэнні гэтых гістарычных крыніц. Так, у 60–70-я гады XX ст. апублікаваны даследаванні С.А. Высоцкага і А.А. Мядынцавай, прысвечаныя надпісам-графіці на сценах кіеўскага і наўгародскага Сафійскіх храмаў.

Значны крок ў даследаванні эпіграфічных помнікаў быў зроблены Б.А. Рыбаковым, які на V Міжнародным кангрэсе славістаў вызначыў асноўныя праблемы эпіграфікі: даследаванне ранніх этапаў пісьменнасці, адмежаванне эпіграфікі ад палеаграфіі, прынцыпы датавання эпіграфічных крыніц і прывядзенне саміх крыніц ў сістэму. Была распрацавана методыка вызначэння датавання помніка не па навейшых ці пазнейшых прыкметах, а па тых, што маюць найбольшую колькасць аналогій.

Павелічэнне колькасці эпіграфічных крыніц цесна звязана з планамерным вывучэннем сярэдневяковых гарадзішчаў супрацоўнікамі сектара археалогіі, створанага ў 1944 г. ў Інстытуце гісторыі АН БССР. Археолагамі вывучаліся лакалізацыя, тапаграфія і матэрыяльная культура старажытных гарадоў Беларусі IX–XIII стст. Праблему эпіграфічных помнікаў у той ці іншай ступені закранулі даследчыкі, якія займаліся вывучэннем сярэдневяковых гарадоў Беларусі. Упамінанні адзіночных эпіграфічных помнікаў сустракаюцца ў працах, прысвечаных археалагічным даследаванням у тым ці іншым рэгіёне, ці ў асобна ўзятым горадзе, дзе эпіграфічныя помнікі вывучаюцца як знаходкі з таго ці іншага пласта ці квадрата ў агульным пераліку знаходак, або проста як знаходкі, якія адносяцца да пэўнай катэгорыі рэчаў. Часам робяцца высновы аб іх прызначэнні ці аб стане пісьменнасці ў гэтым рэгіёне (Ф.Д. Гурэвіч, Э.М. Загарульскі, А.А. Макушнікаў).

У якасці адзінкавых знаходак упамінаюцца эпіграфічныя помнікі ў шэрагу артыкулаў (В.Р. Тарасенка, Л.В. Аляксееў, Т.В. Раўдзіна, Ф.Д. Гурэвіч, А.А. Мельнікава, Г.Ф. Салаўёва).

Эпіграфічныя помнікі таксама разглядаюцца ў асобных главах ці параграфах, прысвечаных даследаванню пісьменства, ці увогуле культуры, якія ўваходзяць ў склад манаграфій, прысвечаных археалагічным даследаванням пэўных гарадоў ці рэгіёнаў (П.Ф. Лысенка, Я.Г. Звяруга, Г.В. Штыхаў, Т.М. Каробушкіна, Л.У. Дучыц).

Агляд эпіграфічных помнікаў робіцца ў абагульняючых артыкулах, прысвечаных распаўсюджванню пісьменнасці на тэрыторыі канкрэтных княстваў, або эпіграфіі акрэсленай тэрыторыі, г. зн. сукупнасці эпіграфічных помнікаў, знойдзеных на канкрэтнай тэрыторыі ці на тэрыторыі беларускіх земляў (Т.М. Каробушкіна, С.У. Тарасаў, Л.У. Калядзінскі, Т.В. Раждзественская, Ф.Д. Гуревіч). Кожная знаходка з надпісам з'яўляецца рэдкай і цікавай, таму ёсць шмат артыкулаў, прысвечаных адзінкавым знаходкам, у тым ліку, і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

новазнойдзеным. Эпіграфічныя помнікі таксама ўзгадваюцца сярод іншых і падобных прадметаў.

Прасочваецца таксама зварот да ранейвывучаных помнікаў, з'яўляюцца інтэрпрэтацыі, даследаванні з мэтай больш паглыбленага вывучэння помніка ці перагледжання традыцыйна існуючага пункта гледжання. (Т.В. Раждзественская, К. Шыдлоўскі, В.А. Варонін, В.Л. Янін, Г.В. Штыхаў, Л.У. Дучыц). У сваю чаргу, дастаткова падрабязнае даследаванне эпіграфічных помнікаў, кожны з якіх прадстаўляе сабой рэдкую і цікавую знаходку, спрыяе ўзнікненню абагульняючых артыкулаў па групах тых ці іншых помнікаў. Абагульняючыя артыкулы па эпіграфічных помніках, знойдзенных на тэрыторыі Беларусі, даюцца ў «Очерках по археологии Белоруссии», дзе ў яны вылучаюцца ў асобныя катэгорыі. Упамінанне эпіграфічных помнікаў даецца ў «Историческом краеведении Белоруссии». У абагульняючай працы «Древняя Русь. Быт и культура» глава 8 «Эпиграфика, писала (стили) и церы» прысвечана эпіграфічным помнікам пісьменства і прыладам для пісьма, і, ў тым ліку з тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Найбольш поўнай работай па старажытнарускай кірылічнай эпіграфіке на сённяшні дзень з'яўляецца манаграфія А.А. Мядынцавай «Грамотность в Древней Руси (по памятникам эпиграфики Х – первой половины XIII века)», дзе абагульняюцца і даследуюцца эпіграфічныя помнікі Х–ХІІІ стст., а таксама даецца методыка датавання надпісаў. Аднак эпіграфічныя помнікі Беларусі ў ёй амаль што не даследаваны, за выключэннем тых, што былі апублікаваны у савецкія часы.

Такім чынам, склалася сітуацыя, калі назапашаны матэрыял патрабуе класіфікацыі, сістэматызацыі і абагульнення, а ў шэрагу выпадкаў, і перагляду існуючай традыцыі чытання і вывучэння некаторых з эпіграфічных помнікаў. Для гэтага існуе даволі вялікая база апублікаваных крыніц і неапублікаваных матэрыялаў з фондаў музеяў Беларусі. Аналіз гістарыяграфіі разглядаемай праблемы дазваляе зрабіць выснову, што эпіграфічныя помнікі як крыніца адлюстравання сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў Х – першай паловы XIV ст. яшчэ не даследаваны. Вывучаліся толькі пэўныя аспекты, у асноўным, ў сувязі з археалагічнымі даследаваннямі гарадзішчаў на тэрыторыі Беларусі або ў сувязі з пытаннямі распаўсюджання пісьменнасці сярод насельніцтва, якое пражывала на тэрыторыі Беларусі ў перыяд сярэдневякоўя. Таму ўся сукупнасць эпіграфічных помнікаў пісьменнасці Х – першай паловы XIV ст. як адлюстраванне сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных працэсаў на тэрыторыі Беларусі павінна стаць прадметам спецыяльнага даследавання. Упершыню з дапамогай эпіграфічных помнікаў як гістарычных крыніц удакладняюцца і дапаўняюцца



шмат якія з праблем сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі ў Х – першай палове XIV ст.

**Глава 2 Крыніцы**

**2.1. Метадалогія і метады даследавання крыніц.** Складанасць праблемы вывучэння эпіграфічных помнікаў абумоўлена тым, што прадмет даследавання з'яўляецца адначасова прадметам даследавання археалогіі, палеаграфіі, мовазнаўства, гісторыі культуры. Метадалагічная аснова даследавання эпіграфічных помнікаў як гістарычнай крыніцы абумоўлена междысцыплінарным падыходам да іх вывучэння і выкарыстаннем даных для характарыстыкі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця краіны. Помнікі эпіграфікі з'яўлюцца каштоўнымі самастойнымі крыніцамі, якія паведамляюць не столькі канкрэтныя факты, сколькі звесткі аб адбываўшыхся ў той час працэсах і з'явах.

Галоўнай умовай даследавання эпіграфічных помнікаў з'яўляецца ўзаемнае вывучэнне прадмета і надпісу на ім, што ўключае ў сябе этап якаснай фіксацыі (малюнкавай і лічбавай) помніка і надпісу на ім, з наступным палеаграфічным, тэксталагічным, рэчазнаўчым аналізам і выкарыстаннем помніка ў якасці паўнацэннай гістарычнай крыніцы і матэрыяла для гістарычных даследаванняў.

Методыка даследавання эпіграфічных помнікаў пісьменнасці, якая будуецца на міждысцыплінарным падыходзе да вывучэння эпіграфічных помнікаў і выкарыстоўвае не толькі мовазнаўчыя і крыніцазнаўчыя, але і гістарычныя метады даследавання, дазваляе праводзіць свайго роду мікрадаследаванне помнікаў як каштоўных самастойных крыніц не губляючы пры гэтым цэласнасці ўсяго даследавання. Такім чынам, найбольшы эфект дае комплексны метад даследавання крыніц, калі даныя розных навук спалучаюцца і ўдакладняюць адзін аднаго. Даныя, атрыманыя ў выніку ўсебаковага даследавання эпіграфічных помнікаў, выкарыстоўваюцца для вывучэння сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных працэсаў, адбываўшыхся ў гэты час на тэрыторыі Беларусі.

**2.2 Класіфікацыя крыніц.** У поле нашага зроку пападаюць вельмі разнастайныя па сваіх памерах, па матэрыялу, на які нанесены надпіс, па зместу надпіса прадметы. Таму вельмі складана класіфікаваць гэтыя рэчы па якой-небудзь адной прыкмеце. Улічваючы складанасці пры класіфікацыі, якія адчувалі даследчыкі, прапануецца класіфікацыя па матэрыялу і катэгорыях рэчаў. Класіфікацыя па матэрыялу, як найбольш стабільная, дае цэласную карціну эпіграфічных помнікаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі. Адначасова дадзеная класіфікацыя з'яўляецца даволі мабільнай, таму што кожны археалагічны сезон дае новыя адкрыцці, і, такім чынам, папаўненне калекцыі эпіграфічных помнікаў не прывядзе к значным зменам у класіфікацыі. Разам з тым, класіфікацыя па катэгорыях рэчаў важна для чытання, дацiроўкі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

інтэрпрэтацыі надпісаў, таму што пэўныя катэгорыі рэчаў існуюць даволі ўстойлівымі групамі. Іх аднароднасць дазваляе рабіць вывады аб існаванні той ці іншай групы рэчаў у пэўны час на пэўнай тэрыторыі і на аснове гэтага рабіць вывады аб працэсах, адбываўшыхся на тэрыторыі у дадзены час.

*Класіфікацыя помнікаў эпіграфікі па матэрыялу і катэгорыях рэчаў:*

1. Надпісы на камені:
   - 1.1. мануменальныя (лапідарныя помнікі);
   - 1.2. надпісы на камянях;
   - 1.3. надпісы на вырабах з каменя:
   - 1.3.1. надпісы на прадметах культа;
   - 1.3.2. надпісы на гаспадарчых прыладах.
2. Надпісы на дрэве:
   - 2.1. надпісы на вырабах з дрэва.
3. Надпісы на метале:
   - 3.1. надпісы на зброі;
   - 3.2. надпісы на посудзе;
   - 3.3. надпісы на прадметах культа;
   - 3.4. надпісы на прадметах упрыгожвання;
   - 3.5. надпісы на прыладах працы.
4. Надпісы на цэгле:
   - 4.1. надпісы на амфарах;
   - 4.2. надпісы на плінфе;
5. Надпісы на косці:
   - 5.1. надпісы на костках;
   - 5.2. надпісы на нарыхтоўках з косці;
   - 5.3. надпісы на вырабах з косці.
6. Надпісы на скуры.
7. Надпісы на шкле.
8. Надпісы на сценах пабудоў:
   - 8.1. граффіці;
   - 8.2. дыпінці.

Такім чынам, класіфікацыя па матэрыялу і катэгорыях рэчаў на дадзены час з'яўляецца найбольш прыдатнай для вывучэння эпіграфічных помнікаў. Яна характэрызуецца стабільнасцю, што дае магчымасць вывучаць помнікі ў сукупнасці па матэрыялу і відах помнікаў і, адначасова, мабільнасцю, г.зн., што новыя эпіграфічныя помнікі ў неабмежаванай колькасці могуць быць уключаны ў дадзеную класіфікацыю.

**Глава 3 Палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё Беларусі ў эпіграфічных помніках пісьменнасці X–XII стст.** Перыяд X–XII стст. на беларускіх землях характарызуецца з'яўленнем першых княстваў-дзяржаў, з наступным іх узмацненнем і паступовым пераходам да феадальнай раздробленасці. Да XI ст. сельскагаспадарчая вытворчасць, якая з'ўлялася асновай гаспадарчага жыцця, ў цэлым дасягнула ўзроўню, характэрнага для



наступных стагоддзяў. Гэта дало штуршок далейшаму развіццю прадукцыйных сіл і аддзяленню рамяства ад сельскай гаспадаркі. Інтэнсіўна развівалася гарадское жыццё. Па ўсёй тэрыторыі старажытнай Беларусі пачынаюць узнікаць гарады, частка якіх узнікла на месцы умацаваных паселішчаў і племянных цэнтраў (Полацк, Гомель), частка мела асновай княжацкія і феадальныя замкі (Заслаўе, Браслаў), некаторыя ўзнікլі на перыферыйных землях славянскай каланізацыі (Гродна, Навагрудак). Сам факт узнікнення гарадоў з'ўляецца сведчаннем высокага ўзроўню эканамічнага і сацыяльнага развіцця. З пачаткам феадальнай раздробленасці пачынаецца рост існуючых гарадоў як адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінак і будаўніцтва значнай колькасці новых гарадоў. З'яўляюцца гарады-крэпасці – фарпосты княстваў. У гарадах адбываецца росквіт рамёстваў, які пацвярджаецца вынікамі археалагічных даследаванняў – шматлікімі знаходкамі вырабаў кастарэзнай, металаапрацоўчай, ювелірнай, дрэваапрацоўчай вытворчасці. Да ўнікальных прадметаў гэтай дзейнасці можна аднесці не толькі добра выкананыя рэчы, свайго роду, шэдэўры, але і прадметы з надпісамі, якія нанесены на вырабы менавіта з ўсіх матэрыялаў.

З'яўленне першых чытаемых надпісаў супадае з часам ўзнікнення і развіцця гарадоў і княстваў-дзяржаў на тэрыторыі Беларусі. Рост колькасьці надпісаў: ад адзінкавых у X ст. – да іх росквіту ў XII ст., на наш погляд, напрамкі звязаны з характэрным для ўсіх княстваў перыядам раздробленасці. У розных княствах ён пачынаўся ў розныя часы, але ўсё ж такі прыпадаў на XII ст. У перыяд X–XII стст. назіралася тэндэнцыя да пераўтварэння цэнтраў новых княстваў у багатыя і моцныя гарады, што было абумоўлена развітай рамеснай вытворчасцю, гандлем, наяўнасцю цэркваў як цэнтраў распаўсюджання хрысціянскай культуры і пісьменнасці. Узвышэнне агульнагарадской культуры дало вялікую колькасць эпіграфічных помнікаў менавіта ў XII ст.

Помнікі эпіграфікі X ст. прадстаўлены адзінкавымі знаходкамі, але з XI ст. у існаванні эпіграфічных помнікаў пачынаецца якасна новы этап, які ўмоўна можна падзяліць на два напрамкі. Па-першае, пісьменнасць пачынае распаўсюджвацца ў асяроддзі высокакваліфікаваных рамеснікаў, княжацкай дружыны. Ёсць таксама сведчанні жаночай і дзіцячай пісьменнасці. Па-другое, адначасова з гэтымі працэсамі, адбываецца пашырэнне ўжывання пісьменнасці там, дзе яна традыцыйна існавала. Гэта сфера гандлю, дзяржаўных структур, рэлігіі. Такім чынам, росквіт гарадской культуры праяўляецца ў існаванні пісьменнасці сярод розных слаёў насельніцтва. Сярод іх, безумоўна, прадстаўнікі ўлады і духавенства, але ў гэты спіс можна ўключыць і рамеснікаў, асабліва высокакваліфікаваных, купцоў. Існаванне пісьменнасці сярод гэтых слаёў насельніцтва было звязана з бытавымі патрэбамі. Аб стане яе распаўсюджання можна зазначыць наступнае: пісьменнасць не мела вельмі шырокага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

распаўсюджання, і, у той жа час, яна не была характэрнай для вузкага абмежаванага кола людзей.

Аналіз месцаў знаходжання эпіграфічных помнікаў дазволіў зрабіць выснову, што эпіграфічныя помнікі X–XII стст. характэрныя толькі для паселішчаў гарадскога тыпу і феадальных сядзіб, што абумоўлена іх сувяззю з гарадской культурай. Такім чынам, эпіграфічныя помнікі могуць стаць у шэрагу вызначальных знаходак пры спрэчных пытаннях вызначэння тыпу паселішча.

Шмат якія з эпіграфічных помнікаў трапляюць на тэрыторыю Беларусі ў выніку гандлёвых сувязяў. Эпіграфічныя помнікі з арабскімі, лацінскімі надпісамі характэрныя для імпартных, прывазных рэчаў. Сярод іх – зброя, прадметы культа, упрыгожанні. Надпісы на такіх прадметах маглі ўспрымацца як элемент дэкору ці як гарант якасці. Адначасова яны з'яўляюцца сведчаннем наўнасці шырокіх гандлёвых сувязяў.

Наяўнасць на дзядзінцах цэркваў з'яўляецца важнай прыметай гарадоў – цэнтраў удзелаў. Менавіта ў найстаражытнейшых цэрквах знаходзяцца надпісы-графіці памінальнага і малітоўнага характару, аўтографы будаўнікоў і прыхаджан, аналагічныя надпісам-графіці іншых цэркваў Старажытнай Русі, але маючых адрозненні ў напісанні, змесце надпісаў. Шмат якія іконкі і медальёны з надпісамі з'яўляюцца вырабамі мясцовых майстроў, як прафесійных майстроў-рэзчыкаў ікон, так і гарадскіх рамеснікаў. Усе гэтыя помнікі, з-за адсутнасці прамых звестак пра хрышчэнне беларускіх земляў, могуць служыць надзейнымі сведкамі распаўсюджання хрысціянства па ўсходнему абраду на землях Беларусі. Але ў той жа час, існаванне такіх рэчаў як амулеты-змеевікі з чытальнымі і нечытальнымі надпісамі, а таксама наяўнасць хатніх (паганскіх) імёнаў у малітоўных надпісах на помніках эпіграфікі даюць прадстаўленне аб існаванні двухвер'я на беларускіх землях.

Такія эпіграфічныя помнікі як Барысавы камяні даюць інфармацыю аб існаванні у Полацкім княстве цэнтралізаванай ўлады і дзейнасці княжацкай адміністрацыі.

Кірылічныя надпісы на прадметах, знойдзеных на перыферыйных землях пражывання ўсходніх славян, падцвярджаюць межы іх расселення. Такімі прадметамі могуць служыць ручка нажа з Драгічына, прасліца з Дрысвятаў, калекцыя костак з гарадзішча Маскавічы.

Эпіграфічныя помнікі даюць цікавую інфармацыю аб розных этнічных групах у саставе насельніцтва, якое пражывала на тэрыторыі сярэдневяковай Беларусі. Калекцыя эпіграфічных помнікаў з рунічнымі надпісамі, лакалізаваная на гарадзішчы Маскавічы, даказвае пражыванне на гэтай тэрыторыі славянізаваных нашчадкаў скандынаваў. Акрамя таго, эпіграфічныя помнікі даюць прадстаўленне аб розных сацыяльных групах у складзе насельніцтва.



Такая інфармацыя змяшчаецца ў заклінальнай частцы надпіса на крыжы Ефрасінні Полацкай і ў некаторых іншых графіці.

Часам эпіграфічныя помнікі ўдакладняюць розныя звесткі. Так, надпіс на амфары з Пінска ўдакладніў сведчанні летапісу аб адбыўшымся тут вяселлі Яраполка. Надпіс на прасліцы, разам з іншымі характэрнымі прадметамі, дазволіў дакладна ўстанавіць месцазнаходжанне княжацкага церама ў Друцку.

Трэба заўважыць, што амаль усе катэгорыі надпісаў маюць аналогіі сярод падобных, распаўсюджаных па ўсёй тэрыторыі пражывання усходніх славян, асабліва па форме і зместу. Але ёсць і адрозненні, адметныя рысы і асаблівасці, звязаныя з уплывамі з суседніх тэрыторый і лакальнымі своеасаблівасцямі. У гэты час, нягледзячы на лакальныя адрозненні, эпіграфічныя помнікі маюць агульныя рысы з такімі ж помнікамі на ўсёй тэрыторыі Старажытнай Русі.

**Глава 4 Эпіграфічныя помнікі XIII – першай паловы XIV ст. аб гістарычных падзеях на землях Беларусі.** Росквіт існавання эпіграфічных помнікаў, які назіраўся ў XII ст., назіраецца і ў XIII ст., але колькасць эпіграфічных помнікаў памяншаецца і шмат якія катэгорыі помнікаў з надпісамі знікаюць зусім. На наш погляд, памяншэнне колькасці эпіграфічных помнікаў адбываецца па трох прычынах. Гэта звязана, па-першае, з палітычнымі і эканамічнымі працэсамі, якія адбываюцца ў гэты час. Так, у сувязі з мангола-татарскім нашэсцем парываюцца шмат якія эканамічныя сувязі і пэўныя катэгорыі ўсходніх імпартных рэчаў, а таксама рэчаў, якія падпісваліся на месцы, але па сваім паходжанні былі імпартнымі, знікаюць. Гэта датычыцца амфар, прасліцаў, некаторых відаў культавых вырабаў. У той жа час, імпартныя падпісныя рэчы з Заходней Еўропы працягваюць трапляць на землі Беларусі.

Па-другое, памяньшэнне колькасці эпіграфічных помнікаў, на наш погляд, было звязана з эканамічным развіццём беларускіх земляў, якія татара-мангольскае нашэсце амаль не закранула. У гэты час гарады, якія з'яўляліся цэнтрамі рамяства і гандлю па сваім развіцці знаходзіліся на адным узроўні з гарадамі Захада і Усхода. У працы рамеснікаў вызначыўся пераход ад працы на заказ да працы на рынак, а ў самой тэхніцы рамяства працягваюцца ўдасканаленні, накіраваныя на павелічэнне масавасці прадукцыі. Такім чынам, вытворчасць некаторых з відаў помнікаў стала больш масавай. Гэта абумовіла іх таннасць. Не было вялікай патрэбы падпісваць рэчы, якія з'яўляліся прадметам масавай вытворчасці і не мелі вялікай каштоўнасці.

Па-трэцяе, памяншэнне колькасці эпіграфічных помнікаў было абумоўлена з'яўленнем паперы, першыя віды якой выкарыстоўваліся ў Заходней Еўропе ўжо ў XII ст., і якая стала шырока ўжывацца з XIV ст. Папера, безумоўна, з'яўлялася больш танным за пергамен матэрыялам. Такім чынам, тыя надпісы, якія наносіліся для дэманстравання пісьменнасці, або ў працэсе навучання пісьму прасцей было наносіць на паперу, а не на прадметы, не прызначаныя для пісьма.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Разам з гэтым назіраецца павелічэнне колькасці помнікаў некаторых відаў. Гэта датычыцца лацінамоўных графіці на сценах Спаса-Праабражэнскай царквы, іх з'яўленне абумоўлена хутчэй непавагай да святыні, чым імкненнем пакінуць малітоўны надпіс.

Для гэтага перыяду таксама характэрна існаванне прадметаў культа з надпісамі, зробленымі мясцовымі рамеснікамі. Але найбольш цікавым і каштоўным прадметам культа для дадзенага перыяду з'яўляецца медальён-літык – ускоснае сведчанне аб падарожжы Войшалка ў Святую зямлю, якое пацвярджае летапісныя даныя.

Некаторыя з помнікаў даюць звесткі аб складзе насельніцтва гарадоў. Ускоснае сведчанне пражывання ў Полацку татарскага насельніцтва – камень з татарскім кірылічным надпісам.

Пераважная большасць надпісаў гэтага часу – кірылічная. Эпіграфічныя помнікі з лацінамоўнымі надпісамі: келіх з гарадзішча Збароў і навагрудскі пярсцёнак з'яўляюцца імпартнымі рэчамі, надпісы на якія былі нанесены на месцы вытворчасці.

Безумоўна, эпіграфічныя помнікі існавалі і ў больш позні час. Але яны прадстаўлены адзінкавымі знаходкамі, надмагільнымі камянямі і пэўнай колькасцю кірылічных і лацінамоўных графіці ў Спаса-Праабражэнскай царкве г. Полацка.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Даследаванне археолагамі, палеографамі, філолагамі, краязнаўцамі, гісторыкамі і культуролагамі эпіграфічных помнікаў Х – першай паловы XIV ст. вырашалі асобныя пытанні гэтых галін навукі і не ставілі мэтай вывучэнне працэсаў сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі ў перыяд сярэдневякоўя [3].
2. Выкарыстанне метадалогіі даследавання, заснаванай на міждысцыплінарным падыходзе да вывучаемага прадмета, выкарыстанне ідэаграфічнага, гісторыка-параўнальнага і гісторыка-тыпалагічнага метадаў даследавання, а таксама распрацоўка класіфікацыі эпіграфічных помнікаў пісьменнасці дазваляюць выкарыстоўваць эпіграфічныя помнікі ў якасці крыніц па гісторыі Беларусі Х – першай паловы XIV ст. і ўдакладніць многія пытанні сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі [1; 2; 7; 8; 10; 12; 13; 14; 15; 16].
3. З'яўленне першых чытальных эпіграфічных надпісаў супадае з часам узнікнення княстваў-дзяржаў і развіцця гарадоў на тэрыторыі Беларусі. Назіраецца рост колькасці надпісаў ад адзінкавых у Х ст. да шматлікіх і



разнастайных у XII ст., што было абумоўлена феадальнай раздробленасцю. Гэты працэс назіраецца ў розных княствах не ў адзін і той жа час, але яго росквіт прыпадае на XII ст. Рост рамяства, гандлю, будаўніцтва новых цэркваў, узвышэнне ролі гарадоў – цэнтраў княстваў прывяло да росту колькасці эпіграфічных помнікаў. Эпіграфічныя помнікі Х–XII стст. характэрны для гарадскіх паселішчаў і феадальных сядзіб, што было абумоўлена іх сувяззю з гарадской культурай і роллю гарадоў у гісторыі Беларусі гэтага часу. Помнікі эпіграфікі з арабскімі і лацінскімі надпісамі з'явіліся на тэрыторыі Беларусі ў выніку развіцця знешняга гандлю. Шырокае распаўсюджанне пісьменнасці сярод гарадскога насельніцтва абумовіла аўтарства эпіграфічных надпісаў. Гэта былі не толькі прадстаўнікі ўлады і духавенства, багатая вярхушка гараджан, але і простыя рамеснікі, гандляры, а таксама жанчыны і дзеці [1; 2; 5; 9; 11; 13; 14; 16].
4. Эпіграфічныя крыніцы Х–XII стст. даюць шматлікі і разнастайны матэрыял па пытаннях сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі ў гэты перыяд. Знойдзеныя археолагамі надпісы-графіці памінальнага і малітоўнага характару, аўтографы будаўнікоў і прыхаджан сведчаць аб наяўнасці цэркваў, якія былі важнейшым прыметай гарадоў-цэнтраў удзелаў. Многія эпіграфічныя надпісы на вырабах сведчаць аб узроўні развіцця рамяства і матэрыяльнай культуры ў гэты перыяд. Іконкі, медальёны і надпісы-графіці з-за адсутнасці прамых звестак хрышчэння Беларусі могуць служыць надзейнымі крыніцамі па праблеме распаўсюджвання хрысціянства на землях Беларусі, існаванне амулетаў-змеевікоў, а таксама знаходкі надпісаў з хатнімі імёнамі сведчаць аб існаванні перажыткаў паганства [1; 5; 16].
5. Пачынаючы з XIII ст. колькасць эпіграфічных помнікаў памяншаецца і асобныя іх катэгорыі знікаюць зусім, што было абумоўлена не толькі сацыяльна-эканамічным і палітычным развіццём. Татара-мангольскае нашэсце прывяло да парушэння гандлёвых сувязяў і некаторыя рэчы з надпісамі імпартнага характару і мясцовай вытворчасці знікаюць. У XIII–XIV стст. на тэрыторыі Беларусі атрымалі распаўсюджанне не толькі берасцяныя граматы, але і летапісы. Развіццё мясцовай вытворчасці з аднаго боку і з'яўленне паперы з другога боку абумовілі памяншэнне эпіграфічных надпісаў. Але помнікі гэтага перыяду даюць разнастайныя звесткі па гісторыі эканомікі, сацыяльнаму і нацыянальнаму складу насельніцтва, пытанням рэлігіі і гісторыі культуры, змене палітычнага становішча Беларусі [1; 4; 16].
6. Эпіграфічныя помнікі Х – першай паловы XIV ст. маюць аналогіі з іншымі крыніцамі, распаўсюджанымі на тэрыторыі пражывання ўсходніх славян, што сведчыць пра падобнасць накірункаў і характараў развіцця эканомікі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сацыяльнай структуры і культуры. Але, у той жа час маюцца адрозненні ў відах помнікаў, змесце надпісаў і іх мове, якія сфарміраваліся пад уздзеяннем рэгіёнаў не славянскага тыпу і асаблівасцямі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі. Такім чынам, эпіграфічныя помнікі пісьменнасці сведчаць не аб адзінай культуры, а аб адзінстве культур усходнеславянскіх народаў [1; 16].

### Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

Вынікі праведзенага даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні абагульняючых навуковых прац, падручнікаў і лекцыйных курсаў па гісторыі Беларусі, дапаможных гістарычных дысцыплінах, гістарычнаму краязнаўству, крыніцазнаўству, гісторыі культуры Беларусі, гістарычнай граматыцы і мовазнаўству, археалогіі, этналогіі для сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў. Каталог эпіграфічных помнікаў можа служыць дадатковай інфармацыяй для гістарычных і краязнаўчых музеяў.

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў навуковых часопісах

1.Калечыц, І.Л. Мар'іна праселка як помнік эпіграфікі / І.Л. Калечыц // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та, Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2005. – № 3. – С. 9–12.

2.Калечыц, І.Л. Да праблемы класіфікацыі помнікаў эпіграфікі Беларусі / І.Л. Калечыц // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та, Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2005. – № 3. – С. 7–9.

3.Калечыц, І.Л. Гістарыяграфія праблемы даследавання эпіграфічных помнікаў перыяду X–XIV стст. / І.Л. Калечыц // Гіст.-археал. зб. – 2006. – № 21. – С. 125–129.

4.Калечыц, І.Л. Выявы галгофскіх і праквітнеўшых крыжоў на каменных эпіграфічных помніках XII–XVIII стст. / І.Л. Калечыц // Гіст.-археал. зб. – 2006. – № 22. – С. 238 –245.

5.Калечыц, І.Л. Эпіграфічныя помнікі X – першай паловы XIV ст. як адлюстраванне сацыяльна–эканамічных, палітычных і культурных працэсаў на тэрыторыі Беларусі / І.Л. Калечыц // Вес. Беларус. дзярж. ун-та, Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2006. – № 3. – С. 41–43.

6.Калечыц, І.Л. Графіці X–XII стст. у Спаса-Праабражэнскай царкве ў Полацку / І.Л. Калечыц // Беларус. гіст. часоп. – 2007. – № 3. – С. 37–45.

### Артыкулы ў навуковых зборніках

7. Калечиц, И.Л. Некоторые аспекты исследования эпиграфики Беларуси / И.Л. Калечиц // Моладзь Берасцейшчыны: зб. студ. навук. прац / Брэсц. дзярж. ун-т; пад рэд. І.І. Акінчыц. – Брэст, 2003. – С. 142–144.



8. Калечыц, І. Похвы з Пінска як эпіграфічны помнік / І. Калечыц, А. Башкоў // Моладзь Берасцейшчыны: зб. студ. навук. прац / Брэсц. дзярж. ун-т; пад рэд. І.І. Акінчыц. – Брэст, 2003. – С. 144–145.

9. Калечиц, И.Л. Роль эпиграфики в исследовании письменности в городах Беларуси (X–XIII вв.) / И.Л. Калечиц // Актуальныя пытанні сучаснай навукі: зб. навук. прац / Беларус. дзярж. пед. ун-т; склад. і навук. рэд. А.Ф. Рацько. – Мінск, 2004. – С. 39–40.

10. Калечыц, І.Л. Азбучныя надпісы-эпіграфемы XII–XIV стст. на тэрыторыі Беларусі / І.Л. Калечыц // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследавання: зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т; склад. і навук. рэд. М.М. Забаўскі. – Мінск, 2004. – С. 22–25.

11. Калечиц, И.Л. Эпиграфемы – знаки собственности на предметах X–XIII вв. в Беларуси / И.Л. Калечиц // Навуковы дэбют: зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т; склад. і навук. рэд. І.І Цыркун. – Мінск, 2004. – С. 15–16.

12. Калечыц, І. Эпіграфічныя помнікі і прылады для пісьма ў зборы Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі / І. Калечыц // Археалагіч. зб. Вып. 1. – Мн., 2006. – С. 78–83.

### Матэрыялы навуковых канферэнцый

13. Калечиц, И.Л. Пряслица как памятники эпиграфики / И.Л. Калечиц // Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., прысвеч. 80-годдзю БДПУ. Мінск, 25 кастр. 2002 г. / Белорус. гос. пед. ун-т; рэдкал.: У.В. Тугай [і інш.]. – Мінск, 2002. – Вып. 2. – С. 198–201.

14. Калечиц, И.Л. Граффити и инскульпты X–XIII вв. как свидетельства распространения грамотности среди населения городов Беларуси / И.Л. Калечиц // Прырода, чалавек, культура: праблемы гармоніі: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 25–26 сакав. 2003 г. / Белар. дзярж. ун-т культуры; рэдкал.: М.А. Бяспалая [і інш.]. – Мінск, 2003. – С. 76–79.

15. Калечыц, І.Л. Гістарыяграфія праблем даследавання пісьменнасці насельніцтва Беларусі X–XIII стст. па эпіграфічных данных / І.Л. Калечыц // Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 28 ліст. 2003 г. / Белорус. гос. пед. ун-т; рэдкал.: У.В. Тугай [і інш.]. – Мінск, 2003. – Ч. 1. – С. 43–46.

16. Люты, А. М. Выкарыстанне даных эпіграфікі ў кантэксце даследавання гісторыі Беларусі сярэдніх вякоў / А.М. Люты, І.Л. Калечыц // Европа: актуальные проблемы этнокультуры: материалы междунар. науч-теор. конф., Минск, 27 апреля 2007 г. / Белорус. гос. пед. ун-т; рэдкал.: В.В. Тугай [и др.]. – Минск, 2007. – С. 203–205.

### Артыкулы ў перыядычных выданнях

17. Калечыц, І.Л. Прылады для пісьма ў старажытнай Беларусі / І.Л. Калечыц // Голас Радзімы. – 24 жніўня 2006 г. – № 33–35 (3007–3009). – С. 9.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## РЭЗЮМЭ

Калечыц Іна Леанідаўна

Адлюстраванне сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў эпіграфічных помніках X – першай паловы XIV ст.

**Ключавыя словы**: помнікі эпіграфікі, эпіграфіка, эпіграфема, графіці, інскульпт, дыпінта, графіта, сацыяльна-эканамічныя працэсы, палітычныя працэсы, культурныя працэсы, адзінства культур.

**Аб'ект даследавання**: сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё Беларусі ў X – першай палове XIV ст.

**Прадмет даследавання**: сукупнасць эпіграфічных помнікаў X – першай паловы XIV ст.

**Мэта** – даказаць, што шляхам вывучэння эпіграфічных помнікаў магчыма даследаванне асобных пытанняў сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі ў X – першай палове XIV ст.

**Метады даследавання**: У аснову даследавання былі пакладзены прынцыпы гістарызма, аб'ектыўнасці, комплекснага падыходу, вывучэнне ўнутры- і знешнетэкставых аспектаў, фармальна-тыпалагічны метад, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, статыстычны, стратыграфічны, палеаграфічны метады, рэчазнаўчы метад даследавання крыніц, што дазволіла ажыццявіць мікрадаследаванне кожнай крыніцы. Былі задзейнічаны сучасныя навукова-метадычныя распрацоўкі, заснаваныя на прымяненні камп'ютэрных тэхналогій, лічбавай фатаграфіі і відэаздымкі.

**Навуковая навізна**: Сукупнасць эпіграфічных помнікаў пісьменнасці X – першай паловы XIV ст., знойдзеных на тэрыторыі Беларусі, упершыню вывучаецца як паўнацэнная гістарычная крыніца і становіцца прадметам спецыяльнага гістарычнага даследавання. Упершыню з дапамогай помнікаў эпіграфікі як гістарычных крыніц удакладняюцца і дапаўняюцца шмат якія з пытанняў сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі ў X – першай палове XIV ст.

**Практычная значнасць**: Вынікі праведзенага даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні абагульняючых навуковых прац, падручнікаў і лекцыйных курсаў па гісторыі Беларусі, дапаможных гістарычных дысцыплінах, гістарычнаму краязнаўству, крыніцазнаўству, гісторыі культуры Беларусі, гістарычнай граматыцы і мовазнаўству, археалогіі, этналогіі для сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў. Каталог эпіграфічных помнікаў можа служыць дадатковай інфармацыяй для гістарычных і краязнаўчых музеяў.





## РЕЗЮМЕ

Калечиц Инна Леонидовна

Отражение социально-экономических, политических и культурных процессов на территории Беларуси в эпиграфических памятниках X – первой половины XIV в.

**Ключевые слова**: памятники эпиграфики, эпиграфика, эпиграфема, граффити, инскульпт, дипинто, графито, социально-экономические процессы, политические процессы, культурные процессы, единство культур,

**Объект исследования**: социально-экономическое, политическое и культурное развитие Беларуси в X – первой половине XIV в.

**Предмет исследования**: совокупность эпиграфических памятников X – первой половины XIV в.

**Цель**: доказать, что путём изучения эпиграфических памятников возможно исследование отдельных вопросов социально-экономического, политического и культурного развития Беларуси в X – первой половине XIV в.

**Методы исследования**: В основу исследования были положены принципы историзма, объективности, комплексного подхода, изучения внутри- и внешнетекстовых аспектов, формально-типологический метод, историко-сравнительный, историко-типологический, статистический, стратиграфический, палеографический метод, вещеведческий метод исследования источников, что позволяло осуществить микроисследование каждого источника. Задействованы современные научно-методические разработки, основанные на применении компьютерных технологий, цифровой фотографии и видеосъёмки.

**Научная новизна**: Совокупность эпиграфических памятников письменности X – первой половины XIV в., найденных на территории Беларуси впервые изучается как полноценный исторический источник и становится предметом специального исторического исследования. Впервые с помощью памятников эпиграфики как исторических источников уточняются и дополняются многие проблемы социально-экономического, политического и культурного развития Беларуси в X – первой половине XIV в.

**Практическая значимость**: Результаты проведенного исследования могут быть использованы при написании обобщающих научных работ, учебников и лекционных курсов по истории Беларуси, вспомогательным историческим дисциплинам, историческому краеведению, источниковедению, истории культуры Беларуси, исторической грамматике и языкознанию, археологии, этнологии для средних и высших учебных заведений. Каталог эпиграфических памятников может служить дополнительной информацией для исторических и краеведческих музеев.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## SUMMARY

Ina Kalechits

The reflection of social-economic, political and cultural processes on the territory of Belarus in epigraphy monuments in the X-th and the first half of the XIV centuries.

**The key words:** epigraphy monuments, epigraphy, epigrapheme, graphity, insculpture, dipinto, graphito, social-economic processes, political processes, cultural processes, the cultural unity.

**The object of research**: social-economic, political and cultural development of Belarus in the X-th and the first half of the XIV centuries.

**The subject of research**: the totality of the ephigraphy monuments of the X-th and the first half of the XIV centuries.

**Purpose** to prove, than research of separate social-economic, political and cultural processes in the history of Belarus in the X-th and the first half of the XIV centuries be able by means of epigraphy monuments learning.

**The methods of research**: The following principles such as: historical method, objectivity, complex approach, learning of aspects inside and outside the text, formal and typological, historical and comparative, historical and typological, statistical, palaeographic, substantial methods have become the research. This allowed to perform micro research of each of them. Modern scientific-methodical elaborations based on using of computer technologies were on.

**Scientific novelty**: the combination of ephigraphic monuments of writing of the X-th and the first half of the XIV centuries, found on the territory of Belarus is learnt as a real historical source for the first time and is becoming the object of special historical research. It is the first time when with the help of epigraphic monuments as historical sources a lot of problems of social-economic, political and cultural development of Belarus in the X-th and the first half of the XIV centuries have been defined.

**Practical importance**: the results of made research can be used in creating of scientific works, textbooks, lecture courses on the history of Belarus, additional historical grammar, historical local lore, the observation of sources, the history of culture of Belarus, linguistics, archaeology, ethnology, for comprehensive schools and higher institutions. The catalogue of epigraphic monuments can serve as additional information for museums of local lore, history and economy.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ


Падпісана ў друк 16.11.07. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 1.1. Тыраж 70 экз. Заказ 525

*Паліграфічнае выкананне:* Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка».
ЛП № 02330/0131508 ад 30.04.04. 220050, Мінск, Савецкая, 18.

*Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка* ў Вучэбна-выдавецкім цэнтры БДПУ.
220007, Мінск, Магілёўская, 37.